# Замацаваць станоўчы вопыт палітычнай работы ў масах

Ц. КІСЯЛЕЎ,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б.

Сіла бальшавіцкай партыі—у непарыўных сувязях з масамі. У цеснай сувязі партыі з народам — залог непераможнасці нашай краіны, самая трывалая аснова сусветна-гістарычных перамог Совецкага Саюза.

Таварыш Сталін вучыць, што партыя павінна пастаянна расшыраць сувязі з масамі, чутка прыслухоўвацца да голасу мас.

Асноўным метадам кіраўніцтва бальшавіцкай партыі масамі быў заўсёды метад пераканання. Партыя няспынна напамінае, што найпершым абавязкам комуніста з'яўляецца яго штодзённая работа па пераканашню працоўных, па растлумачэнню ім палітыкі партыі.

Сярод розных форм, пры дапамозе якіх партыя ажыццяўляе сваю сувязь з масамі, важнае месца займаюць непасрэдныя сустрэчы кіруючых кадраў партыі з працоўнымі.

Выступленні кіруючых работнікаў перад народам з'яўляюцца важным сродкам мабілізацыі совецкіх людзей на выкананне задач, пастаўленых партыяй.

ЦК ВКП(б) неаднаразова ўказваў на неабходнасць выступлення кіруючых партыйных, совецкіх, профсаюзных і комсамольскіх работнікаў з палітычнымі дакладамі перад насельніцтвам. Партыя надае гэтаму пытанню вялікае значэнне і патрабуе, каб гэта рабілася сістэматычна.

Выконваючы ўказанні Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), ЦК КП(б) Беларусі устанавіў, як сістэму, рэгулярныя выступленні кіруючых кадраў компартыі бальшавікоў Беларусі з палітычнымі дакладамі непасрэдна ў калгасах і на прадпрыемствах. ЦК КП(б)Б ужо другі раз падвёў вынікі праведзеных у рэспубліцы сходаў калгаснікаў, рабочых і служачых з дакладамі кіруючых работнікаў.

У верасні—кастрычніку з дакладамі аб бягучым моманце ў калгасах і на прадпрыемствах рэспублікі выступіла 7.500 кіруючых работнікаў рэспубліканскіх, абласных і раённых арганізацый, якія прачыталі больш 11 тысяч дакладаў, ахапіўшы імі звыш мільёна працоўных.

Што паказалі праведзеныя сходы? Перш за ўсё тое, што працоўныя праяўляюць велізарную цікавасць да палітычных дакладаў. На дакладах, як правіла, прысутнічае столькі людзей, колькі можа змясціць памяшканне. Дакладчыкам задаецца многа пытанняў. Калгаснікі выказваюць свае задавальненне з повадаў таго, што да іх пачалі прыязджаць кіруючыя работнікі з палітычнымі дакладамі.

Палітычныя даклады садзейнічаюць павышэнню ўзроўню ўсёй масава-палітычнай работы ў вёсцы. Па патрабаванню ЦК КП(б)Б дакладчыкі, прыязджаючы ў калгасы, дэталёва знаёмяцца са становішчам спраў у іх і канкрэтна дапамагаюць пярвічным партарганізацыям у правядзенні масава-палітычнай работы. Многія дакладчыкі ЦК КП(б)Б, абкомаў і райкомаў партыі, будучы ў калгасах, інструктавалі агітатараў, дапамагалі ў падрыхтоўцы і правядзенні партыйных сходаў, у складанні планаў масава-палітычнай работы, у выпуску насценных газет і г. д.

Так, напрыклад, начальнік Упраўлення па асваенню малых рэк пры Совеце Міністраў БССР тав. Бударын гутарыў з агітатарамі, інструктаваў дакладчыкаў Полацкага райкома партыі.

Намеснік міністра Дзяржкантролю БССР тав. Сугак у калгасах «1 Мая» і «Чырвоная змена» Талачынскага раёна разам з сакратаром партарганізацыі і агітатарамі намеціў рад мерапрыемстваў па выражэнню чарговых задач, што стаяць перад калгасамі.

Старшыня ЦК профсаюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы тав. Чарноў, будучы ў калгасе імя Молатава Жлобінскага раёна, правёў інструктыўную нараду агітатараў, прысутнічаў на іх гутарках.

Дацэнт інстытута народнай гаспадаркі тав. Іпа інструктаваў агітатараў, дапамог ім у арганізацыі нагляднай агітацыі.

Падобных прыкладаў можна прывесці многа.

Аднак далёка яшчэ не ўсе дакладчыкі, прыязджаючы ў калгасы, дапамагаюць партарганізацыям ва ўзмацненні масава-палітычнай работы. Ёсць нямала выпадкаў, калі дакладчыкі прыязджаюць у калгас за гадзіну — дзве да даклада і, прачытаўшы яго, неадкладна ад'язджаюць. Такія адносіны да правядзення палітычных дакладаў не адпавядаюць патрабаванням Цэнтральнага Камітэта.

Будучы ў калгасах, дакладчыкі ЦК, абкомаў і райкомаў КП(б)Б дапамагаюць партыйным арганізацыям і праўленням калгасаў у павышэнні ўзроўню арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасці калгасаў. Уваходзячы ў сутнасць справы, дакладчыкі выяўляюць недахопы ў гаспадарчай дзейнасці і дапамагаюць калгасам іх ліквідаваць. Калгаснікі, як правіла, пасля дакладаў ставяць рад пытанняў, звязаных з палепшаннем работы арцелі. Многія дакладчыкі разам з раённымі і абласнымі арганізацыямі вырашалі неадкладныя для калгасаў гаспадарчыя пытанні.

Дакладчык ЦК КП(б)Б тав. І. І. Карпякоў, прыбыўшы 1 кастрычніка ў калгас «Маладая гвардыя» Валожынскага раёна, выявіў, што ў калгасе не прыступілі яшчэ да ўборкі бульбы, не было закончана церабленне ільну і да т. п. Тав. Карпякоў правёў пасяджэнне праўлення калгаса разам з актывам, дзе былі намечаны мерапрыемствы па ліквідацыі выяўленых недахопаў. Да 10 кастрычніка калгаснікі закончылі ўсе намечаныя работы.

Галоўны аграном Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР тав. Ляўша, вывучыўшы становішча ў калгасе імя Сталіна Гомельскага раёна, дапамог пярвічнай партыйнай арганізацыі выпрацаваць план канкрэтных мерапрыемстваў па завяршэнню сельскагаспадарчых работ і ўмацаванню грамадскай гаспадаркі.

Многія дакладчыкі прынялі непасрэдны ўдзел у стварэнні калгасаў у заходніх абласцях рэспублікі.

На жаль, не ўсе дакладчыкі рабуюць высветліць магчымасці ліквідацыі недахопаў на месцы. Некаторыя таварышы абмяжоўваюцца проста пералікам заўважаных недахопаў у дакладной запісцы на імя ЦК КП(б)Б.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы